**М. Шэвякова**

# МАТЫЎ РАЮ Ў ПАЭМЕ А. МІЦКЕВІЧА “ПАН ТАДЭВУШ”

Архетып Раю праламіўся праз прызму культурна-гістарычных эпох і мастацкіх стыляў. Для адных Рай быў літаральным, як у Бібліі, для іншых – абстрактнай ідэяй, сацыяльным ці духоўным ідэалам, увасабленнем гармоніі, да якой імкнецца чалавецтва. Творчасць А. Міцкевіча-рамантыка выклікае асаблівы інтарэс, таму што ў адрозненне ад сваіх папярэднікаў эпохі Сярэднявечча, Рэнесансу і Барока, ён, застаючыся хрысціянінам, арыентуецца не на біблейскія архетыпы і сюжэты, а на свецкую культуру. Вяршыняй творчасці А. Міцкевіча з’яўляецца паэма “Пан Тадэвуш” (1834), напісаная ў эміграцыі

ў Парыжы. Немагчымасць сваёй фізічнай прысутнасці на радзіме паэт кампенсуе прысутнасцю духоўнай. Менавіта як ідэальнае месца на зямлі, створанае воляй Усявышняга для чалавека, малюецца на старонках паэмы родная Навагрудчына, яе прырода, жыццё шляхецкай сядзібы Сапліцова. Невыпадкова У. Конан назваў гэты твор творча-мастацкай сублімацыяй, пераўтварэннем тугі па радзіме ў яркія карціны сельскага Раю. Топас паэмы лакальны. Гэта куток у глыбокай правінцыі, адарваны ад мітусні і бедаў вялікага свету, дзе бразгае зброя і вядзецца перадзел свету ў напалеонаўскіх войнах. Час тут запаволены, жыццё поўнае мірных клопатаў землеўладальнікаў. Апісанні гэтага зямнога Раю ў А. Міцкевіча афарбаваны настальгіяй па незваротна страчаным і падлягаюць ідэалізацыі.

У творы можна знайсці вобразы, якія ўзыходзяць да біблейскага архетыпа Раю. Так маладыя героі, Тадэвуш Сапліца і Зося, якія паўстаюць перад чытачом у пачатку твора, выклікаюць асацыяцыі з вобразамі першых людзей, Адама і Евы. Яны жывуць у райскім садзе і яшчэ не ведаюць, што чакае іх далей. Своеасаблівым спакуслівым забароненым плодам з'яўляецца для Тадэвуша спрактыкаваная прыгажуня Талімена, якая зачаравала хлопца сваёй гаворкай, прыгажосцю, веданнем свету. Яна ж паўстае і як каварны змей-спакушальнік, які разбурае былую чысціню і нявіннасць людзей. Менавіта з ёй здараецца грэхападзенне Тадэвуша. Ксёндз Робак, ён жа зніклы Яцэк Сапліца, адлюстроўвае выратавальную руку Божую, бо праз яго ахвярную смерць адбываецца выкупленне граху і мірацца старыя ворагі Гервазы і Пратазы.

Атаясамліванне роднай Навагрудчыны з Раем для Міцкевіча натуральнае, бо гэта не толькі край яго нараджэння. Тут адбылося яго сталенне, тут ён рос сярод некранутай прыроды, знаёміўся з багаццем беларускага фальклору, тут спазнаў сапраўднае сяброўства і каханне, тут, у Навагрудку, быў яго сапраўдны Дом (пасля будзе толькі вечнае пілігрымства і тулянне). Таму Рай для яго зямны, гэта яго радзіма, Літва-Беларусь (Litwo, Ojczyzno moja!), а сябе ён асэнсоўвае вечным выгнаннікам з гэтага Раю.